*Кандраценка А.С.*

# МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў 1939–1941 гг.

Мюнхенская канферэнцыя, а потым і Венскі арбітраж 1938 года стварылі перадумовы для захопу чэхаславацкай тэрыторыі нацысцкай Германіяй. У якасці стратэгічнага варыянта быў абраны дыферанцыяваны падыход да чэхаў і славакаў, пры якім ліквідацыя чэхаславацкай дзяржавы выглядала б як унутраны распад.

Неўзабаве пасля Мюнхена яскрава праявіўся разлад паміж чэхамі і славакамі. Гэтым скарысталася Глінкава славацкая народная партыя (ГСНП). 6 кастрычніка 1938 г. яе выканаўчы камітэт абвясціў у Жыліне аўтаномію Славакіі [7, с. 67]. Аўтаномны ўрад з самага пачатку сутыкнуўся з неабходнасцю забяспечыць славацкую граніцу ад тэрытарыяльных памкненняў Венгрыі і Польшчы, якія выдзвінулі прэтэнзіі на тэрыторыі, дзе кампактна пражывалі венгерская і польская этнічныя меншасці. У паветры вітала ідэя стварэння венгерска-польскай граніцы, то бок раздзела Славакіі. Чэхаславацкі ўрад,жадаючы пазбегнуць сур’ёзнага канфлікта з Польшчай, перадаў ёй частку Сілезіі і паўночнай Славакіі. Перамовы з Венгрыяй, якая патрабавала ўсе славацкія землі, вынікаў не далі. Двухбаковая праблема вышла на міжнародны ўзровень і 2 лістапада 1938 г. міністры замежных спраў Германіі і Італіі падпісалі ў Вене пагадненне аб новай граніцы паміж Славакіяй, Падкарпацкай Руссю і Венгрыяй. Венгрыі была перададзена тэрыторыя ў 10 309 кв. км. з насельніцтвам у 853 670 чалавек, з каторых 272 145 былі славакамі па нацыянальнасці [13, с. 210].

У выніку акупацыі Чэхаславакіі нямецкімі войскамі ў сакавіку 1939 г. быў створаны Пратэктарат Багемія і Маравія, а на славацкіх землях была абвешчана незалежнасць Славацкай Рэспублікі. Часткі вермахта ў той жа дзень увайшлі на тэрыторыю заходняй Славакіі, раззброілі славацкія гарнізоны і занялі важныя ваенныя аб'екты краіны. Праз тыдзень ва Усходнюю Славакію былі ўведзены венгерскія войскі, якія ўзялі пад свой кантроль шырокія тэрыторыі, у тым ліку буйныя гарады як Ужгарод і Кошыцэ. Так пачалася г. зв. «Малая вайна», якая на доўгія гады дыстабілізавала славацка-венгерскія адносіны.

Пад націскам Германіі, славацкі і венгерскі бакі дамовіліся спыніць баявыя дзеянні і стварыць буферную зону. 3 красавіка 1939 г. нямецкі пасол у Будапешце О. фон Эрдмансдорф сустрэўся з міністрамзамежных спраў Венгрыі І. Чакі для абмеркавання будучыні славацка-венгерскай граніцы. Венгерскі міністр заявіў, што «там, дзе прайшлі венгерскія салдаты, яны і застануцца» [9, с. 99].

Дзякуючы перамозе ў «Малой вайне» Венгрыя атрымала Сабранецкую акругу і частку акругі Свіна, агульнай плошчай у 1056 кв. км, што ўключала



Рэпазіторый ВДУ

74 вёскі з насельніцтвам у 40 777 чалавек, палова з якіх былі славакамі [9, с. 100]. Спыненне баявых дзеянняў дазволіла захаваць незалежнасць новаўтворанай Славацкай дзяржавы. Венгрыя вярнула сваю «законную» тэрыторыю. Германія стрымлівала супярэчнасці паміж Венгрыяй і Славакіяй, і ў той жа час, славацка-вянгерскі канфлікт. Аб гэтым сведчыць дыпламатычная перапіска Будапешта з Рымам [4, с. 405].

З моманту стварэння Славакія апынулася ў сферы ўплыву Германіі, пра што сведчыць падпісаная 18 сакавіка 1939 г. Ахоўная дамова. У адпаведнасці з ёй Германія брала на сябе ахову палітычнай незалежнасці і цэласнасці славацкай тэрыторыі. Славацкі ўрад пагаджаўся на перадачу паўнамоцтваў над ахоўнай зонай у заходняй Славакіі. Дзякуючы гэтаму пункту, нямецкія ўзброеныя сілы у гэтай зоне мелі права ў любы час ствараць ваенныя аб’екты і ўтрымліваць іх пад кантролем. Славацкі ўрадпавінен быў арганізаваць свае ўзброеныя сілы толькі пры згодзе з урадам Германіі [12, с. 305–306]. Дадзены дакумент заклаў аснову для славацка-нямецкіх адносін. Дамова абавязала славацкі ўрад праводзіць сваю знешнюю палітыку ў строгай адпаведнасці са знешняй палітыкай нямецкай дзяржавы.

Да Ахоўнай дамовы быў далучаны Сакрэтны пратакол аб эканамічным і фінансавым супрацоўніцтве ад 23 сакавіка 1939 г. Славацкі ўрад не мог без згоды Германіі весці перамовы па эканамічных пытаннях з іншымі дзяржавамі. Уся інфармацыя аб наяўнасці такіх перамоў перадавалася нямецкаму боку [12, с. 308–309]

Нямецкі ўплыў у Славакіі ажыццяўляўся праз нямецкую амбасаду, службу бяспекі (СБ), службу ваеннай разведкі, Нямецкую партыю на чале з Ф. Кармазіным і іншыя структуры. Найбольшы ўплыў на славацкі ўрад мела служба бяспекі. З самага пачатку служба бяспякі падтрымала радыкальнае крыло ГСНП і аказвала ўплыў на далейшае палітычнае развіццё Славацкай Рэспублікі [8, с. 36].

Пра залежнасць Славацкай Рэспублікі ад нацыскай Германіі сведчыць той факт, што яшчэ ў красавіку 1939 г. А. Гітлер прапаноўваў Польшчы частку Славакіі ў якасці кампенсацыі за г. Данцыг і польскі калідор у Прусіі. Польскі ўрад не пагадзіўся з прапановай. У гэтай сувязі Германія стала разглядаць славацкую тэрыторыю ў якасці плацдарма для наступлення на Польшчу.

На міжнароднай арэне Славацкая Рэспубліка была прызнана саюзнікамі нацысцкай Германіі, а таксама джяржавамі, якія захоўвалі на пачатак Другой сусветнай вайны нейтралітэт:Бразілія, Швейцарыя, Сальвадор, Ватыкан і інш., агулам 27 краін. Вялікабрытанія прызнала Славацкую дзяржаву толькі дэ-факта. ЗША не мелі нават такога намеру [11, с. 77–80].

Між тым, ужо ў верасні 1939 г. Савецкі Саюз, які раней не прызнаваў ліквідацыю Чэхаславакіі і незалежнасць Славакіі, заняў станоўчую



Рэпазіторый ВДУ

пазіцыю ў славацкім пытанні. На зменуу знешняй палітыцы СССР паўплывала падпісанне пакта Молатава-Рыбентропа. Так, 14 верасня 1939 г. славацкі пасол у Берліне М. Чэрнак па ініцыятыве міністра замежных спраў Славацкай Рэспублікі Ф. Дзюрчанскага сустрэўся з кіраўніком савецкай дыпламатычнай місіі ў Германіі А. Шкварцавым. Апошні праінфармаваў Маскву аб славацка-савецкіх перамовах і запрасіў далейшыя інструкцыі[2, с. 80]. На наступны дзень наркам замежных спраў В. Молатаў паведаміў Шкварцаваму аб згодзе СССР дыпламатычна прызнаць Славацкую Рэспублікі, што і было зроблена 16 верасня 1939 г. [2, с. 82]. 11 снежня 1939 г. Ё. Ціса назначыў паслом у Маскве Ф. Ціса, савецкі пасол у Браціславе Р. Пушкін прыступіў да сваіх абавязкаў 2 лютага 1940 г. [1, с. 231].

На пачатковым этапе станаўлення славацка-савецкіх адносін дамінавалі дзве лініі – геапалітычная і эканамічная. Варта адзначыць, што славакі чакалі дапамогі ад Савецкага Саюза ў славацка-венгерскім тэрытарыяльным пытанні. Пачынаючы з вясны 1940 г. Ф. Дзюрчанскі распачаў дзейнасць, накіраваную на вяртанне акупаваных венграмі тэрыторый. Ён спадзяваўся на дапамогу Савецкага Саюза ў гэтым пытанні. У Славакіі распаўсюджваліся чуткі, што СССР хоча далучыць да сябе Карпацкую Украіну, якая была акупавана венгерскімі войскамі 9 сакавіка 1939 г. [3, с. 305–306]. У выніку гэтага Славацкая Рэспубліка мела б прамую граніцу з Савецкім Саюзам, якая б здолела аслабіць венгерскія тэрытарыяльныя памкненні. У дадзеным славацка-венгерскім пытанні СССР паводзіў сябе вельмі асцярожна. Як падсумоўваў Р. Пушкін «ад нас славакі чакаюць, бадай, больш, чым мы можам ім даць» [5, с. 83]. Пачынаючы з канца лета 1940 г. славацка-савецкія адносіны сталі прыметна пагаршацца. На гэта паўплывалі змены ў славацкім урадзе і ўмацавання ўплыву пранацысцкага крыла ў ГСНП [1, с. 237].

У кастрычніку 1940 г. паміж Германіяй і славацкім урадам была падпісана дадатковае сакрэтнае пагадненне да Ахоўнай дамовы. У адпаведнасці з ім Славакія прадастаўляла немцам прамысловыя аб’екты, а таксама славацкая армія падлягала рэфармаванню па ўзоры нямецкай арміі. Сведчаннем цеснага саюза Славацкай Рэспублікі з Трэцім Рэйхам стала далучэнне Славакіі (разам з Румыніяй і Венгрыяй) 24 лістапада 1940 г. да Траістага пакта і адпраўка 23 чэрвеня 1941 г. войск (славацкай матарызаванай дывізіі) для вайны супраць СССР [6, с. 370].

У выніку, ускосным следствам мюнхенскага крызісу 1938 г. стала наданне Славакіі аўтаномнага статусу ў Чэхаславакіі. Гэта быў першы крок да пабудовы славацкай дзяржаўнасці. Менавіта пад ціскам Германіі 14 сакавіка 1939 г. была абвешчана Славацкая Рэспубліка. З'яўленне новай дзяржавы азначала распад Чэха-Славакіі па нямецкаму раскладу. Становішча Славакіі ў германскай сферы ўплыву вызначыла Ахоўная дамова, падпісаная 18 сакавіка 1939 г. У адпаведнасці з якой Германія

Репозиторий ВГУ

брала на сябе ахову палітычнай незалежнасці і цэласнасці славацкай тэрыторыі. Знешняя палітыка Славакіі павінна была праводзіцца ў цесным кантакце з Германіяй. Славацкая Рэспубліка была прызнана 27 краінамі, аднак казаць аб тым, што яна стала раўнапраўным суб'ектам на міжнароднай арэны не даводзіцца. Славакія фактычна ішла ў адным рэчышчы з палітыкай, якую праводзілі краіны «асі». Сведчаннем гэтага стала тое, што 24 лістапада 1940 г. Славакія далучылася да Траістага пакта. Варта адзначыць, што славацка-савецкія міждзяржаўныя кантакты 1939–1941 гг. пагаршаліся паралельна з нямецка-савецкімі адносінамі. Славацкая Рэспубліка як саюзнік Германіі ўступіла ў вайну супраць Савецкага Саюза. Такім чынам, абставіны, пры якіх Славакія стала незалежнай, прывялі да таго, што славацкая дзяржаўнасць была ўспрынята як пабочны прадукт германскай знешняй палітыкі.


1. Грубонь, А. Словацко-советские отношения в 1939–1941 гг. / А. Грубонь // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навуковы зборнік. Выпуск 11 / рэдкал. : У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2016. – С. 227–238.
2. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Госполитиздат ; Международные отношения, 1958–2000. – Т. 22. – Кн. 2 : 1 сентября – 31 декабря 1939 г. – 688 с.
3. Марьина, В.В. Советский Союз и чехо-словацкий вопрос во время Второй мировой войны 1939–1945 гг. Кн. 1. 1939–1941 гг. / В.В. Марьина. – М. : Индрик, 2007. – 448 с.
4. Пушкаш, А.И. Внешняя политика Венгрии: Февраль 1937 – сентябрь 1939 г. / А.И. Пушкаш. – М. : Институт славяноведения РАН, 2003. – 460 с.
5. Сальков, А.П. Словацко-венгерский национально-территориальный конфликт и международные отношения в Карпато-Дунайском регионе (март 1939 – май 1945 г.) / А.П. Сальков // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 8 / редкол. : А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2013. – С. 68–98.
6. Чехия и Словакия в XX веке: очерки по истории : кн. 1. / В.В. Марьина (отв. ред.) [и др.] – М. : Наука, 2005. – 453 с.
7. «Tretiaríša» avznikSlovenského štátu : dokumenty / I. M. Schvarc (eds.). – Bratislava : Ústavpamätinároda: SNM – Múzeum kultúry karpatských Nemcov, 2008. – 635 s.
8. Baka, I. Politický systém a režim Slovenské republiky v rokoch 1939–1940 / I. Baka. – Bratislava : Vojenský historický ústav, 2010. – 322 s.
9. Janek, I. The History of the Slovak-Hungarian «Little War» and Its Interpretations in National Histories / I. Janek // Prague Papers on the History of International Relations, 2. – Praha : Univerzita Karlova, Ústřední knihovna, 2015. – P. 85–101.
10. Mosný, P. Dejiny štátu a práva na Slovensku po roku 1918 / P. Mosný. – Košice : Univerzita Praha J. Šafárika, 1997. – 241 s.
11. Rosputinsky, P. K otázke štátnosti Slovenského štátu / P. Rosputinsky // Acta FF ZČU. – 2016. – S. 75–100.
12. Slovensko-nemecké vzt'ahy 1938–1941 v dokumentoch: v 2 sv. Sv. I. : od Mníchova k vojne proti ZSSR / E. Nižňanský [a kol.]. – Bratislava : Universum, 2009. – 1174 s.
13. Viedenská arbitráž 2. novembrer 1938: Dokumenty II., Okupácia (2. novembrer – 14. marec) / zost. L. Deák. – Bratislava : Matica slovenska, 2003. – 304 s.




Репозиторий ВГУ